# АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XVI ст.

**М. К. Чупрыс**

Палітыка адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу земляў Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), а таксама і беларускіх земляў, заняла даволі працілеглы час. Умовы, уплываўшыя на падзел земляў пачалі адбывацца яшчэ ў XIV–XV стст., калі “асноўнымі найбуйнейшымі адміністрацыйнымі ўтварыннямі з’яўляліся княствы”.

На тэрыторыі Беларусі ў XIII ст. існавала каля 20 удзельных княстваў. Яны ўяўлялі сабою дробныя дзяржаўныя ўтварэнні. На чале кожнага княства стаялі князі, якія мелі ўсе правы суверэнных валадароў. Увогуле, княствам з’яўлялася дзяржаўнае ўтварэнне з пэўным узроўнем суверэнітэту ці аўтаноміі, якое кіравалася князем. Даволі вялікая колькасць княстваў упамініецца ў летапісах: Полацкае, Віцебскае, Менскае, Друцкае, Ашмянскае, Гарадзенскае, Наваградскае, Кобрынскае, Пінскае, Клецкае, Слуцкае і іншыя. Нярэдка княствы ў летапісах, дагаворных граматах і іншых тагачасных дакументах называліся землямі. Сярод адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак XIII–XIV стст. згадваюцца таксама воласці (адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ, населеная сялянамі-даннікамі, якія ўтваралі тэрытарыяльную абшчыну), якія генетычна былі звязаны з сельскімі абшчынамі і на тэрыторыі якіх ажыццяўлялася кіраванне шэрагам сельскіх пасяленцаў. Яны паўставалі, як часткі, альбо асобныя адзінкі дзяржаўна-княжацкіх уладанняў. Трэба адзначыць, што амаль усе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі падпадалі пад падзел на дзве агульныя, вельмі прыкладна акрэсленыя дзяржаўныя паловы Вялікага Княства Літоўскага і Рускага: Літву і Русь. Вярхоўная ўлада ВКЛ кіравала праз князёў-васалаў, сярод якіх былі прадстаўнікі мясцовых княжацкіх дынастый. У буйных беларускіх княствах, напрыклад як у Полацкім і Віцебскім, княжылі па волі Вялікага князя асобы манаршага дому. Абласных князёў нельга было лічыць аднаасобнымі і незалежнымі ад Вялікага князя. Яны былі хутчэй суправіцелямі Вялікага князя. Тым не менш вярхоўная ўлада была толькі аб’яднальным механізмам кангламерату зямель Вялікага Княства Літоўскага.

З канца XIV – пачатку XV стст. Вялікі князь Вітаўт ліквідаваў княжацкія пасады ў Віцебску, Новагародку, Полацку і змяніў мясцовых князёў сваімі намеснікамі. Намеснікі кіравалі намесніцтвамі, большасць якіх было ўтворана як раз у гэты час. Як удакладняецца ў навуковых крыніцах, такая палітыка праводзілася дзеля цэнтралізацыі дзяржавы і ўмацавання вялікакняжацкай улады. Важна адзначыць, што інстытут

намесніцтва абсалютна ніякім чынам не ламаў традыцыйнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і сістэмы кіравання. У той час, намесніцкая пасада была прызначальнай Вялікім князем і цалкам перад ім адказнай.

На працягу XV ст. пад уплывам Польшчы намесніцтвы пачалі называцца паветамі, а нераздзялённыя ў прыватную уласнасць воласці – староствамі ці дзяржавамі. Акрамя таго, захоўваўся традыцыйны падзел ВКЛ на Віленскую і Троцкую часткі, якія з 1413 г. сталі называцца ваяводствамі. Паняцце ваяводства было ўведзена паводле Гарадзельскага прывелея 1413 г, калі на аснове былых тэрытарыяльных княстваў былі ўтвораны Віленскае і Трокскае. Кіраваў ваяводствам ваявода – службовая асоба, кіраўнік мясцовай адміністрацыі. Ваявода засядаў у Радзе ВКЛ. Пасада прызначалася пажыццёва з ліку буйных феадалаў, абавязкова ўраджэнцаў ВКЛ. Ён ажыццяўляў адміністрацыйную ўладу, кантроль над крыніцамі дзяржаўных і вялікакняжацкіх даходаў, арганізацыю войска, выконваў судовыя функцыі ў замкавам судзе, а таксама карыстаўся значнай аўтаноміяй. Ваяводствы з'яўляліся асноўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай у ВКЛ у XV–XVIII стст.

Можна сказаць, што з самага пачатку XVI ст. у Беларусі, як увогуле на ўсёй тэрыторыі ВКЛ, пачалі праходзіць актыўныя змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле, у дзяржаўнай і мясцовай уладзе.

У пачатку XVI ст. у ВКЛ аформілася 2-узроўневая адміністрацыйная структура. Вышэйшы узровень утваралі Віленскае, Віцебскае, Кіеўскае, Навагародскае, Полацкае, Смаленскае ваяводствы, Валынская і Жамойцкая землі. Яны падзяляліся на княствы, намесніцтвы і панскія вотчыны. У 1508 г. была вернута Любецкая вобласць і далучана да Кіеўскага ваяводства.

У 1513 г. было створана Падляшскае ваяводства, у якое, апрача ўласна Падляшша, увайшлі Берасцейскі, Камянецкі і Кобрынскі паветы.

Найбольш значны ўплыў на адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ у XVI ст. аказала рэформа перыяду 1565–1566 гг., у выніку якой дзяржава была нанова падзелена на асноўныя тэрытарыяльныя адзінкі: 13 ваяводстваў і 30 паветаў (16 паветаў знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі). Існавалі наступныя ваяводствы: Берасцейскае, у якое ўваходзілі Берасцейскі і Пінскі паветы, Брацлаўскае, не меўшае паветаў, Валынскае, цэнтрам у якога з'яўляўся Луцк, і ў якое ўваходзілі Крамянецкі, Луцкі і Уладзімірскі паветы, Віленскае, аб'ядноўваўшае ў сабе Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі, Вількамірскі і Лідскі паветы, Віцебскае, у склад якога ўваходзілі Аршанскі і Віцебскі паветы,

Кіеўскае, за якім лічыліся Жытомірскі, Кіеўскі, Мазырскі, Оўруцкі, Чаркаскі, Чарнобыльскі паветы, Менскае з Менскім і Рэчыцкім паветамі, Мсціслаўскае, не меўшае паветаў, Навагародскае, уключаўшае ў сябе Ваўкавыскі, Навагародскі і Слонімскі паветы, Падляшскае з Бельскім, Драгічынскім і Мельніцкім паветамі, Полацкае і Жмуцкае, не меўшыя паветаў, і Троцкае, у якое ўваходзілі Гарадзенскі, Ковенскі, Троцкі і Упіцкі паветы. Таксама, можна сказаць, што значная частка тэрыторыі Полацкага ваяводства ў 1563–1581 гг. фактычна заставалася пад кантролем Расіі. Адметнай рысай падзелу было тое, што колькасць ваяводстваў з часам мянялася, таму нельга дакладна вызначаць на якія часткі была падзелена тэрыторыя ВКЛ, а таксама і беларуская тэрыторыя. Аднак, як пішуць у кароткай энцыклапедыі Беларусі: "На территории Белоруссии были Брестское, Виленское, Витебское, Минское, Мстиславское, Новогрудское, Полоцкое и Трокское воеводства". У перыяд адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу існавала сістэма ранжырвання ваяводств. Пачынаючы з другой паловы XVI ст. першае месца ў іерархіі ваяводстваў на тэрыторыі Беларусі займала Віленскае ваяводства. Наступным у іерархіі знаходзілася Троцкае, потым Жамойцкае, Смаленскае, Полацкае, Новагародскае, Віцебскае, Берасцейскае, Мсціслаўскае і Менскае ваяводствы. Дадзеная ранжыравачная сістэма мела значэнне пры прызначэнні на вышэйшыя пасады ў дзяржаве і тычылася ваявод, кашталянаў, маршалакаў земскіх (вялікіх) і дворных, канцлераў, гетманаў найвышэйшых (вялікіх) і польных, падскарбіяў земскіх, старастаў.

Адной з асноўных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, паводле рэформы, быў павет. Кожны павет меў свой прадстаўнічы орган – шляхецкі соймік (сход шляхты павета, дзейнасць якога рэгламентавалася нормамі права). Значнай рысай соймікаў было тое, што яны вырашалі пытанні не толькі свайго павета, але і агульнадзяржаўныя пытанні, давалі інструкцыі сваім паслам на сойм. Такім чынам, можна казаць, што соймікі, вызначаючы і вырашаючы галоўныя пытанні, зацікаўленнасці, цяжкасці ў сацыяльнай сферы, адыгрывалі даволі значную ролю ў жыцці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (паветаў).

Хоць непасрэдна ў дакументах ВКЛ нідзе не згадвалася пра адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, але ў Статуце 1588 г. называліся тыя пасады, якія былі адказнымі за такія тэрытарыяльныя адзінкі, як ваяводства, павет і іншыя. Напрыклад, у артыкулах 14, 15, 22 (о врядниках придворных, воеводах, старостах окраинных и людях служилых, которые от правовой ответственности не должны отговариваться) раздзела першага, артыкулах 1 (об обязанности, как все жители

здешнего государства службу земскую должны служить), 6 (о сборах и движению шляхты на войну), раздзела другога, артыкуле 30 ( что должны судить воеводы, старосты и державцы и о их позвах, о чем должны выдаваемы быть, и о наказании за неявку стороны и о задержании на месте преступления) раздзела чацвертага і іншых раздзелах Статута ВКЛ 1588 г.

Важна таксама адзначыць, што на працягу XIV–XVI стст. адбываўся значны рост гарадоў і гарадскога насельніцтва. Гарады станавіліся цэнтрамі рамяства і гандлю. Па памерах яны адрозніваліся, большая частка з іх былі невялікія. Паступова, пачынаючы з XV ст. раслі гарады і паселішчы гарадскога тыпу – мястэчкі. Яны ўзнікалі як на дзяржаўных, так і на прыватнаўласніцкіх землях. Каля 40% гарадоў належылі феадалам. Гарады, што належылі феадалам, былі адміністрацыйнымі, гаспадарчымі і культурнымі цэнтрамі іх зямель. Жыхары гэтых гарадоў неслі феадальныя павіннасці на карысць свайго гаспадара. Насельніцтва дзяржаўных, ці вялікакняжацкіх, гарадоў лічылася асабіста вольным.

Істотныя тэрытарыяльныя змены ў ВКЛ адбыліся ў 1569 г. перад заключэннем Люблінскай уніі. Са згоды шляхты Падляшша Кіеўскае, Валынскае і Брацлаўскае ваяводствы былі далучаны да Польшчы. Толькі Мазырскі павет застаўся ў складзе ВКЛ і быў уключаны ў Мінскае ваяводства. Колькасць ваяводств у ВКЛ была зменшана да 9, а паветаў – да 22, 16 з якіх знаходзілася на тэрыторыі Беларусі.